– **М. Ч.:** Мне кажется, это мнение неверно. По этой схеме попытался сыграть Синицын. В 1999 году он мне говорил: не надо участвовать, надо ждать. И что это ему дало? Кто признал Синицына единым кандидатом? Он тоже занимал очень высокий пост и тоже ушел добровольно, подал заявление об отставке. Я считаю, то же самое было бы со мной, не участвуй я в выборах 1999 года. Кроме того, не думаете ли Вы, что не будь тогда выборов, Запад бы признал Лукашенко легитимным президентом? Также именно после тех выборов я стал хорошо узнаваем. Так что я ни о чем не жалею и считаю, что благодаря президентским выборам 1999 года мои шансы стали выше.

*– **А. Сакович:** На пути к победе единого кандидата очень много проблем. Но какая, на Ваш взгляд, основная?*

– **М. Ч.:** Прозрачность выборов. Нужно исключить фальсификации. Когда Лукашенко заявляет, что ОБСЕ готовит 14 тысяч террористов, называя так наблюдателей, это значит, что он готовится к фальсификациям.

*– **А. Сакович:** Но как исключить фальсификации?*

– **М. Ч.:** Номенклатуре уже осточертела работа на Лукашенко. Они же сейчас выключают телефоны и динамики, если надо что-нибудь между собой обсудить. Есть, конечно, опасность того, что они будут выполнять приказ о фальсификации выборов. Но что будет дальше? Можно поднять зарплату. Пусть не до ста долларов, а до восьмидесяти. Но через месяц-два после выборов ситуация резко ухудшится. И все поймут, что власть их обманула в очередной раз, и, возможно, с этим не смирятся. Ведь недавно работники сферы образования без труда собрали 180 тысяч подписей под своими требованиями. Поэтому номенклатура должна задуматься: сегодня мы фальсифицируем результаты, а что завтра? Посмотрите на сегодняшнюю Украину. Можно выиграть выборы, но не выиграть ситуацию.

За фальсификации рано или поздно придется отвечать. Фальсифицирует выборы не Лукашенко лично, а конкретные чиновники, которых мы все знаем. Я знаю тех, кто фальсифицировал результаты на парламентских выборах по моему округу. Когда я пытался встретиться с председателем комиссии, посмотреть ей в глаза, она не согласилась на эту встречу, потому что ей все понятно. На референдуме 1996 года был четкий инструктаж, на котором Лукашенко сказал: «*Вы определитесь. Кто не способен выиграть референдум – уйдите сегодня. Потому что если вы останетесь и проиграете референдум, то расставание будет тяжелым*».

Я после этого задавал вопрос вертикальщикам: как они поступят? Они отвечали: выиграем. Но при этом добавляли, что если бы это были президентские выборы, то все было бы не так однозначно. До референдума и после него президент остается прежним. И то, что он обещал, то и сделает. Шансов избежать наказания тогда у вертикальщиков не было. А сейчас ситуация другая. Я фальсифицирую результаты, но сделает ли то же самое мой сосед? И что будет потом? Поэтому, зачем им идти на уголовно наказуемое преступление?

*– **А. Король:** Но Лукашенко пытается добиться полного подчинения номенклатуры. Пытается уверить всех в своей непобедимости.*

– **М. Ч.:** Убедить в этом всех у него не получится. Вы же знаете и позицию России. Возможно, открыто она и не поддержит оппозиционного кандидата, но Лукашенко также не поддержит ни в каком случае. Лукашенко и Беларусь становятся проблемой России во взаимоотношениях с Западом. На первом месте, конечно, стоит проблема Чечни, но на втором – Беларусь.

*– **О. Петров:** Кто из вашей пятерки стал бы наиболее приемлемым для России кандидатом?*

– **М. Ч.:** Я думаю, они решатся на поддержку только наиболее проходного кандидата. Чем больше Россия будет поддерживать Лукашенко, тем больше в Беларуси будет антироссийских настроений. Потому что ухудшение ситуации в стране большинство связывает с Лукашенко, а его с Россией.

*– **А. Король:** В вашем «Обращении к соотечественникам» многих насторожило словосочетание «Союз (с заглавной буквы «с») с Россией». Как Вы видите этот союз, и как видится Вам защита суверенитета?*

– **М. Ч.:** Я считаю ошибкой и бесполезным мероприятием введение российского рубля на нашей территории: единый эмиссионный центр в Москве – это очень опасная потеря суверенитета. Но есть еще и Европейский Союз. Тоже с большой буквы, но там все сохраняют свой суверенитет. Еще могу сказать однозначно: без российского рынка, без каких-то льгот на нем нам выжить будет невозможно. Промышленные комплексы Беларуси, Украины, России создавались в советское время как единое целое. Например, тракторный завод выпускал тракторы «Беларус» не только для нас самих, но и для России. Поэтому этот рынок нам надо сохранять, за него бороться, зарабатывать на нем большие деньги.

*– **А. Король:** А как же с путем Беларуси на Запад?*

– **М. Ч.:** Экономический союз с Россией не мешает развитию отношений с Западом. Главное, что мы должны сделать – это дать возможность иностранным инвесторам придти к нам и работать. Это первый шаг, без которого мы цивилизованной страной стать не можем. Так уж случилось, что и деньги, и технологии сегодня на Западе. Не у нас и даже не в России. Россия сегодня сама использует западные технологии. Я работал в международном концерне, который поставлял в Россию оборудование. Несколько лет назад Россия импортировала много европейского пива. Но потом они модернизировали с помощью импортного оборудования свои пивзаводы и прекратили импортировать пиво. Есть небольшие партии, которые ввозятся ради разнообразия, не более того. Абсолютное большинство марок пива производятся в России по западным технологиям и почти не уступают им по качеству.

*– **Т. Попова:** Как привлечь к нам иностранных инвесторов?*

М. Ч.: Желание работать в Беларуси у них было. У нас открылось в свое время представительство «Форда», «Филипс» хотел сотрудничать с «Горизонтом» и с гомельским заводом «Коралл» по выпуску телевизионных трубок. Беларусь имела более высокие возможности, более образованную рабочую силу, чем, например, та же Польша. Достаточно было сравнить качество польского трактора «Урсус» с нашим «Беларус». Наш был лучше. Для поляка белорусский телевизор или холодильник был вершиной счастья. Так что наши рабочие были больше подготовлены к иностранным инвестициям.

Но сегодня все изменилось. Там сейчас не нужна наша техника, потому что именно туда, а не в Беларусь, пошли инвестиции. Конечно, сейчас привлекать инвесторов сложнее. Допустим, когда иностранцы модернизировали украинские мощности по выпуску лекарств, то рассчитывали это производство с учетом не только своих, но и наших потребностей. Так что вкладывать деньги в аналогичное предприятие в Беларуси вряд ли кто-то будет.

Но привлекать инвестиции все равно надо. Какая разница рабочему, где работать: на тракторном заводе или на заводе «Форд»? На «Форде» зарплата будет выше. А раз выше зарплата, то больше будет поступлений в бюджет. От этого выигрывают все. Но сегодня, прочитав декрет президента №41, никакой инвестор сюда не придет. Он понимает, что может лишиться всех своих денег в один момент.

*– **А. Сакович:** По какой модели следует проводить приватизацию?*

– **М. Ч.:** Сферу торговли, услуг надо немедленно отдать в частные руки. Зачем государству брать на себя эту обузу, заниматься ими? Жизнь все поставит на свои места. Кто хорошо торгует – хорошо живет. Плохо – разоряется. С крупной же промышленностью спешить нельзя ни в коем случае. Если есть крупные инвесторы для крупных предприятий, согласные вложить десятки миллионов долларов, надо идти на приватизацию как можно быстрее. Если нет таких инвесторов, то спешить не надо. Стратегические направления надо оставлять в ведении государства. И я сторонник введения института частной собственности на землю. Колхозно-совхозная система финансируется за счет бюджета, за счет народа. Но никакого эффекта это не приносит и никогда не принесет. Надо хотя бы дать возможность развиваться фермерам.

*– **А. Король:** Каков характер взаимоотношений коалиции пятерых с демократическими партиями?*

– **М. Ч.:** В части контроля за выборами я никаких проблем не вижу. В части же технологии проведения выборов, я считаю, КРДС допустила ошибку. Когда со мной начали переговоры по этому поводу, я спросил: «*А почему после принятия решения вы со мной советуетесь, почему сначала было не провести круглый стол с участием известных политиков, членов партий и беспартийных, обсудить ситуацию, наметить план?*» Этого не произошло.

И второй момент – это уже заслуга власти – на сегодняшний день партии не пользуются доверием у населения. Власти добились того, что население ассоциирует все партии с Белорусским народным фронтом. У партий есть свой электорат, активисты, но основная масса жителей Беларуси ассоциирует партийность с каким-то антинародным движением. Открытая связь потенциального кандидата с КРДС и партиями сегодня вредит ему. Нельзя сейчас обойтись без поддержки партий, но и нельзя поднимать вверх партийное знамя. Большинство людей хочет видеть независимого кандидата.

*– **А. Король:** В программе кандидатов есть запись о том, что, в случае прихода к власти, вы берете на себя обязанность обеспечить зарплату на уровне 300 долларов в ближайшие три года. Это ваш ответ на 100 долларов президента? Не популистские ли это обещания?*

– **М. Ч.:** Я практически не сомневаюсь, что тот путь, который прошли в Польше, мы тоже сможем пройти. А у них зарплата сейчас гораздо выше 300 долларов. Конечно, будет трудно. Но это достижимо. Придется пойти на структурную перестройку экономики. Поэтому основная проблема будет – создать новые рабочие места. Уволенным и сокращенным надо будет найти новые хорошие рабочие места.

*– **О. Петров:** На всем постсоветском пространстве, кроме Прибалтики, наблюдаются авторитарные тенденции: Путин в России, Кучма на Украине. Может, зря мы боремся с режимом Лукашенко? Может, это объективный этап в истории трансформации постсоветских стран?*

– **М. Ч.:** Такого авторитаризма, как в Беларуси, нет ни на Украине, ни в России. Там все-таки губернаторы избираются, Зюганов имеет возможность критиковать власть через СМИ. Да, определенная тенденция к авторитаризму в России присутствует, но я не думаю, что она достигла угрожающих масштабов. Да и на Украине выборы проводились не так, как у нас проводился референдум 1996 года и парламентские выборы 2000 года. А в том, что мы можем многое сделать для демократизации нашей страны, у меня даже сомнений нет. ■

ГІСТОРЫЯ

Спрыяльны для будучыні кантэкст

ГАННА ПІЛАТОВІЧ

Прайшоў Міжнародны навуковы семінар, прысвечаны абмеркаванню культурнай спадчыны Вялікага княства Літоўскага і яе значэння для сённяшніх Беларусі і Літвы

Вялікае княства Літоўскае сваёй дзяржавай па праву лічаць не толькі беларусы, але і палякі, і літоўцы – гэта дзяржава была іх сумесным домам больш за два стагоддзі. Сёння гэтыя народы маюць свае незалежныя дзяржавы і сваю гісторыю, у якой значнае месца займае сумесны перыяд пражывання. І кожны з гэтых народаў мае свой погляд на той гістарычны перыяд.

Абмеркаванню культурнай спадчыны ВКЛ і яе значэння для сённяшніх Беларусі і Літвы, узаемаразумення ў Еўропе быў прысвечаны Міжнародны навуковы семінар. Ён адбыўся ў вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці ў Літоўскім культурным, асветным і інфармацыйным цэнтры. Арганізатарамі семінара выступілі Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», Літоўскі культурны, асветны і інфармацыйны цэнтр і Польскі інстытут у Вільнюсе.

Яшчэ ў 1992 годзе пад эгідай Цэнтра даследаванняў Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў Любліне, якім кіруе прафесар Ежы Клачоўскі, адбылася сустрэча гісторыкаў Літвы, Украіны, Беларусі і Польшчы. У рамках гэтага сумеснага праекта прадугледжвалася напісанне даследаванняў, прысвечаных гісторыі краін былой Рэчы Паспалітай, якія не ўтрымлівалі б у сабе вобразаў ворагаў, а гісторыкі паспрабавалі знайсці паразуменне, наладзіць дыялог.

На сёння ў рамках таго праекта ўжо выйшла на ўкраінскай і польскай мовах кніжка Наталлі Якавенкі «Нарыс гісторыі Украіны да канца 18 ст.» Рыхтуюцца кніжкі па адпаведных перыядах гісторыі ў Літве і ў Беларусі. Неадназначна ў свой час была ўспрынятая кніга пад назвай «Гісторыя Цэнтральна-Усходняй Еўропы», якая, па задуме Ежы Клачоўскага, аб'яднала ў адзін кантэкст рэгіянальныя гісторыі. Вельмі балючая рэакцыя ў сувязі з гэтым выданнем паследавала з боку расіян, якія ўспрынялі яе як ідэалагічную акцыю, як праграмны дакумент па аднаўленні Рэчы Паспалітай. Бо гэта сумесная навуковая праца ідзе ўразрэз з папяроднімі напрацоўкамі савецкіх даследчыкаў, разбурае створаныя раней міфы.

Праца інстытута Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў Любліне ў гэтым накірунку працягваецца, у прыватнасці, была перавыдадзена кніга «Ад уніі Фларэнтыйскай да уніі Брэсцкай», дзе ідзе гаворка аб уніяцкай царкве.

У час канферэнцыі былі разгледжаны разнастайныя аспекты культурнай спадчыны ВКЛ для кожнага з народаў, што там пражывалі, адбылася прэзентацыя праекта гістарычнага атласа ВКЛ.

«*Раней пра Рэч Паспалітую казалі толькі як пра краіну палякаў*, – кажа прафесар Ян Скарбек з Польшчы, – *пазней як пра краіну двух народаў, цяпер жа ва ўжытак уводзіца паняце «краіна многіх народаў». І гэта адпавядае гістарычнай справядлівасці, бо акрамя палякаў там пражывалі і лічылі ВКЛ сваёй радзімай беларусы, літоўцы, татары, рускія стараверы, яўрэі...*»

Дарэчы, такая пастаноўка пытання, як сказаў Ян Скарбек, далёка не адразу была ўспрынятая польскім грамадствам. Як і кніга прафесара Камінскага з Вашынгтона, які напісаў гісторыю Рэчы Паспалітай многіх народаў. Яна таксама была ўспрынятая ў штыкі, узнікла шырокавядомая дыскусія аб польскім імперыялізме. Цяпер жа вядуцца дэбаты аб тым, што менавіта з культурнай спадчыны ВКЛ «сваёй» спадчынай могуць лічыць беларусы або літоўцы. Але, на думку ўдзельнікаў канферэнцыі, праблемы такой на самай справе не існуе, спадчына ВКЛ належыць усім.

Здавалася б, чаму ў XXI стагоддзі пытанне культурнай спадчыны ВКЛ па-ранейшаму актуальнае?

«*Ніхто, я думаю, не мае намеру падзяліць, скажам, Міцкевіча або змяніць дзяржаўныя межы... Але сумесна зразумець, як і чаму мяняліся гэтыя межы – магчыма. Многія пытанні дастаткова складаныя*, – каментуе Хенрык Гапскі. – *Пакуль што няма такой магчымасці, каб усе раптам з усімі момантамі пагадзіліся. Палякі доўга ішлі да разумення і публічнага прызнання таго, што ўсю тэрыторыю Рэчы Паспалітай нельга называць выключна польскай. Патрэбны і беларусам, і літоўцам нейкі час, каб паглядзець на сябе непрадузята. Але сэнс якраз у тым, што ўсе так званыя «малыя радзімы» складалі шматнацыянальную, шматканфесійную, шматмоўную краіну, якая ўяўляла сабой правобраз, унікальную мадэль будучай еўрапейскай дзяржавы*».

Новыя падыходы патрабуюць, на думку вучоных, напісання новых сучасных падручнікаў, абмеркавання і ўдакладнення тэрміналагічных паняццяў, а галоўнае – узаемаразумення і пастаяннага дыялогу.

Прафесар Хенрык Гапскі лічыць, што канферэнцыя ў Рымдзюнах прайшла ў вельмі спрыяльным для будучыні кантэксце. Гісторыю, як вядома, змяніць нельга. Кожны бок мае сваю ацэнку і інтэрпрэтацыю мінулага. Пазітыўным момантам з'яўляецца тое, што кожны прымае да ведама канцэпцыю іншага.

Сустрэчы гісторыкаў і дыскусіі па вострых пытаннях, на думку ўдзельнікаў канферэнцыі, павінны быць сістэматычнымі, што дасць магчымасць пашырыць культурную прастору, знайсці кропкі судакранання і ўзаемаразумення.

МЕРКАВАНЬНЕ

СПЫНІ ГУЛЬНЮ!

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Гульня – неад'емная частка сучаснага чалавечага жыцця. Праз гульню чалавек самасцьвярджаецца, мадэлюе й мадыфікуе ўласныя паводзіны. Без гульні няма дзейнасьці, прагрэсу і творчасьці. Без яе няма існаваньня. Прынамсі, няма экзыстэнцыі эліты ў постмадэрновым кантэксьце.

Вельмі цікава глядзець, як уваскабляецца гэтая тэза на прыкладзе сучаснай беларускай эліты.

Пачну з прафэсыйна блізкай тэмы рок-н-ролу. Лідары айчыннага року, нарэшце дасягнуўшы татальнай папулярнасьці, з размахам гуляюць у гурт *RED HOT CHILI PEPPERS*, капіруюць іх канцэртовыя і іміджавыя фішкі. Не, гэта не плягіят, а бяскрыўдная гульня ў лідараў заходняга мэйнстрыму. Побач хлопцы з БМА груп граюць у заходні рэкард-лэйбл, ладзячы прэс-канфэрэнцыі з прэзэнтацыямі альбомаў, часам запрашаючы журналістаў на фуршэты.

Але ж рок-н-рол – мастацтва сцэнічнае, і элемэнты захапляючай гульні з імітацыяй глядзяцца ў ім не так весела, як, прыкладам, у палітыцы. Там усё выглядае значна цікавей...

Дзядзькі-нацыяналісты з вышэйшай адукацыяй з асалодай гуляюць ў кандовых беларусаў. Гульня вельмі захапляльная, бо дае адчуваньне патрыярхальнасьці, надзейнасьці й ўласнай непрабівальнасьці. «*...Дакажы мне, што электрон існуе. Я ж палешук – пакуль не памацаю, не паверу!*»

Недагуляўшы ў партактывы, лідары партый і прафсаюзаў гуляюць у палітбюро ЦК КРДС. Яны праводзяць паседжаньні, выбіраюць кіруючыя ворганы і плятуць партыйныя інтрыгі.

Народны фронт гуляе ў самога сябе ўзору 1996 году. Адчайныя спробы паўтарыць магутны «Чарнобыльскі шлях» выклікаюць істэрычны сьмех у тых, хто пяць год назірае за сытуацыяй. Шчыра кажучы, і тады мы, насамрэч, гулялі ў «Дзяды-88» і «Вільню-91».

Анархісты вельмі хочуць пагуляць у заходніх антыглябалістаў. Праўда, дагэтуль у іх ставала мазгоў заставацца ў рэальнасьці. Па прызнаньні аднаго з антыглябалістаў, тыя проста пакутуюць ад комплексу віны, што не паходзяць зь месца, дзе трэба змагацца, каб выжыць. Таму яны гуляюць у змаганьне і «Парыж-68».

Беларускай інтэлігенцыі вельмі хочацца пагуляць у савецкіх дысыдэнтаў. З гэтай нагоды на Быкава з задавальненьнем нацягваюць пінжак Салжаніцына. Быкаў не супраціўляецца – ён проста не заўважае гэтай мітусні. Яшчэ інтэлігенцыя любіць гуляць у прэзыдэнцкія выбары, са смакам абмяркоўваючы магчымых залежных ды незалежных кандыдатаў. Калі выбары будуць абвешчаныя і кандыдатам спатрэбіцца мінімум па сто тысяч подпісаў на кожнага, гульня стане менш цікавай.

Лідары студэнцкага руху спрабуюць падняць студэнтаў на калектыўныя рэвалюцыйныя дзеяньні – «зубры» вельмі хочуць пагуляць у сэрбскія «Студэнтскі пратэст» ці «ОТПОР!» Прынамсі гэтая спроба гульні ў сэрбаў выглядае лепей за папярэднія – «Адзінства ў дзеяньні», «Малады фронт», «Маладзёжная салідарнасьць», «Пераменаў!»...

Тэлевядучы Зімоўскі з натхненьнем грае ў Сяргея Дарэнку, а незалежныя журналісты – у сумленных абаронцаў праўды і ліхтароў розуму ў апошняй інстанцыі.

...Астатнія 80 адсоткаў насельніцтва ня ведаюць пра гэтыя гульні ды постмадэрновыя канцэпцыі. Яны атрымліваюць дробныя грошы за паскудную працу і жывуць у брудных пад'ездах. Яны цалуюцца ў парках і атрымліваюць у твар у падваротнях. Яны кахаюць і робяць дзяцей, часам чытаюць газэты ці пьюць горкую ў адзіноце. Іхнае жыццё бывае поўным падзеяў або роўным, як крышка труны. Але яны ніколі не гуляюць. Яны – жывуць. ■

ПРАБЛЕМА

ХТО ПАЕХАЎ, А ХТО ПРЫЕХАЎ...

Крыху аб тэндэнцыях, пры якіх доля карэннага насельніцтва ў Беларусі будзе непазбежна змяншацца

ГАННА ПІЛАТОВІЧ

Сёння беларуская дыяспара складае больш за чвэрць беларускай нацыі – па падліках навукоўцаў, 3–3,5 мільёна чалавек. 2 мільёны 130 тысяч з іх – у новых незалежных рэспубліках, што ўтварыліся на тэрыторыі былога СССР. Але гаворка наша не толькі пра масавы эміграцыйны рух з Беларусі, што павялічваецца ў апошнія гады, але і пра іміграцыю да нас.

Адна з новых тэндэнцый у міграцыйных працэсах, што адбываюцца на тэрыторыі Беларусі, як паведамілі ў Камітэце па міграцыі пры Міністэрстве працы Беларусі, – гэта тое, што наша краіна мае цяпер дадатнае эміграцыйнае сальда. Беларусь прыняла ў перыяд з 1992 па 1999 гады 668 тысяч чалавек, а выехала з краіны 495 тысяч. Не лішне пацікавіцца, хто ж гэта прыехаў да нас на сталае жыхарства?

«*У пераважнай большасці з той масы, што прыняла на працягу апошняга дзесяцігоддзя наша краіна – гэта не беларусы*, – кажа Галіна Сяргеева, кандыдат гістарычных навук, супрацоўніца Нацыянальнай акадэміі навук. – *Сярод прыехаўшых людзі розных нацыянальнасцяў, многа рускіх і ўкраінцаў, нямала бежанцаў з «гарачых кропак», і пры цяперашняй дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі – мы ведаем, што з 1996 года ў нас не павялічваецца насельніцтва, а наадварот, кожны год змяншаецца – гэта даволі небяспечная сітуацыя. У тым плане, што доля карэннага насельніцтва пры такіх тэндэнцыях непазбежна будзе змяншацца*».

Вядома, вярталіся на Бацькаўшчыну і беларусы. У 1990–1991 гадах – 75 тысяч чалавек, а ў 1992–1999 – яшчэ 188 тысяч. Гэта прыкладна 10–11 працэнтаў з той колькасці нашых суайчыннікаў, што аселі на постсавецкай прасторы. Як жа сустрэлі іх на радзіме, як паклапаціліся аб збіранні нацыі кіраўнікі дзяржавы? Ды ніяк. Людзі апынуліся ў жахлівай сітуацыі: без жылля, сродкаў на існаванне. Дзяржава не дбала ні аб іх працаўладкаванні, ні аб набыцці крэдыту на жыллёвае будаўніцтва. Многія проста вымушаны былі пасяліцца ў Гомельскім і Магілёўскім раёнах, забруджаных радыяцыяй.

Закона аб рэпатрыяцыі, як можна здагадвацца, пакуль што не прадбачыцца. Кажуць, што ў дзяржавы няма на гэта сродкаў. Знаходзяцца ж яны на іншыя, нават і не на такія важныя справы. Польшча, напрыклад, якая сёлета прыняла закон аб рэпатрыяцыі, абмежавала пакуль што кантынгент тых, каму будзе аказана дзяржаўная дапамога, – гэта палякі, якія пражываюць у азіяцкім рэгіёне былога СССР. У нас жа пра гэта нават і гаворкі не вядзецца, бо збіранне, умацаванне і кансалідацыя нацыі ніяк не ўваходзяць у пералік прыярытэтных задач дзяржавы. Усё робіцца наадварот: раскалоць, сутыкнуць ілбамі, стварыць такія ўмовы для жыцця, каб разбегліся самі па свеце...

Пэўна, няма зараз на Беларусі чалавека, які не хацеў бы тым ці іншым шляхам выехаць за мяжу: на пастаяннае жыхарства ці падзарабіць грошай. Калі ў пачатку 90-х гадоў асноўным кантынгентам выязджаючых на пастаяннае месца жыхарства за мяжу былі яўрэі, то ўжо да сярэдзіны 90-х іх шэрагі значна папоўнілі і беларусы. А рэзкі рост колькасці фірмаў, што прапануюць іміграцыю ў ЗША, Канаду, Новую Зеландыю і Аргенціну, сведчыць, што жадаючых выехаць з Беларусі становіцца ўсё больш. І каб у людзей былі неабходныя для гэтага сродкі, то значная частка насельніцтва, напэўна, ужо выбралася б адсюль.

З 1993 па 1997 гады Беларусь пакінулі ці выехалі на працу па кантракту 220 перспектыўных спартсменаў і больш за 100 трэнераў. Пакідаюць краіну разам са сваімі капіталамі прадпрымальнікі. Яны тлумачаць свой выезд неспрыяльнымі падатковымі і інвестыцыйнымі ўмовамі гаспадарання. Так, толькі на працягу 1997 года дэпартамент эміграцыі МУС Чэхіі выдаў візы на пастаяннае жыхарства некалькім сотням беларускіх бізнесменаў, якія перанеслі сваю дзейнасць на тэрыторыю Чэшскай Рэспублікі. Незалежныя эксперты лічаць, што напрыканцы 1998 года больш за 30 тысяч грамадзян Беларусі вялі свой бізнес у Расіі, ва Украіне, у Польшчы, Чэхіі, Прыбалтыцы, працуючы аб'ектыўна на павышэнне ўзроўню жыцця ў гэтых дзяржавах. Але не ў сваёй.

Пэўнае, але далёка не поўнае, ўяўленне аб памерах працоўнай эміграцыі даюць лічбы тых, хто зарэгістраваў свае кантракты ў Міністэрстве працы: за межамі Беларусі ў 1994 – 1314 асоб, у 1995 – 1692, у 1996 – 1894, у 1997 – 3226, у 1998 – 3692 асобы. Але рэальна толькі ў Расіі за першае паўгоддзе 1996 года работу знайшлі больш за 10 тысяч грамадзян Беларусі. За першае паўгоддзе 1998 года 334 жыхары РБ атрымалі дазвол на працу ў Польшчы. Уладкоўваюцца працоўныя мігранты пераважна будаўнікамі, вадзіцелямі гарадскога транспарту, на сельскагаспадарчых работах, ніжэйшых прыступках сферы абслугоўвання ў Польшчы і іншых дзяржавах.

Па неафіцыйных ацэнках, цяпер за межамі Беларусі працуюць да 100 тысяч жыхароў краіны. Значная частка іх – так званыя нелегалы. Гэта самая неабароненая частка нашай эміграцыі за мяжой. У расійскіх сродках масавай інфармацыі, прынамсі, неаднойчы адзначалася, што ненатуральна танныя беларускія рабочыя на нелегальным рынку працы Расіі і ненатуральна танныя беларускія тавары на маскоўскіх рынках даўно ўжо служаць неабвержным доказам цяжкай хваробы беларускай эканомікі.

Па дадзеных апытання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з Дзяржаўнай міграцыйнай службай, каля 300 навукоўцаў і выкладчыкаў ВНУ (з іх амаль палова дактары і кандыдаты навук) выехалі ў 1991–1995 гадах у ЗША (38%), Ізраіль (32%), Расію (10%), Германію (7%), Канаду (3%). У другой палове 90-х лічба гэта выросла ўдвая.

У ЗША пражываюць спевакі А. Кашапараў, В. Пархоменка, А. Казак, А. Забара, акцёры Р. Харык, Р. Маленчанка, А. Караблёў, піяніст Л. Кузьмін, гітарыст А. Растопчын, кампазітар Д. Яўтуховіч, мастак Ю. Пучынскі, у Італіі - оперная спявачка М. Гулегіна, у Францыі – мастакі Б. Заборай і М. Паўлоўскі, спявак А. Валодась, скрыпачка Л. Колас, у Германіі – музыкант А. Бадзьяраў, скрыпач А. Крамараў, у Англіі – мастак В. Мартынчык, у Чэхіі – паэт С. Сокалаў-Воюш, у Ізраілі – музыкант Л. Тышко...

Адток за мяжу «залатога» генафонду нацыі працягваецца. Чаго варты выпадак, калі група беларускіх студэнтаў (цалкам 30 чалавек) не вярнулася дамоў са стажыроўкі ў ЗША. Яны пісалі бацькам, што не бачаць сваёй будучыні ў краіне, павернутай тварам у мінулае.

«*Наша краіна першай на постсавецкай прасторы займела палітычную эміграцыю ў сярэдзіне 90-х гадоў. І звязана гэта перш за ўсё* – лічыць Г. Сяргеева, – *з непрыняццем пэўнай часткай грамадства таго антыдэмакратычнага рэжыму і палітычнага курсу, што ажыццяўляецца кіраўніцтвам краіны. Сотні маладых, адукаваных людзей просяць палітычнага прытулку ў розных замежных краінах – Бельгіі, Чэхіі, ЗША, Польшчы*».

Сучасная беларуская палітычная эміграцыя стварае свае асяродкі ў замежжы. Яна гуртуецца вокол кааліцыі беларускіх арганізацый у абарону дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі, якая аб'ядноўвае больш за 10 арганізацый. Нядаўна створаны беларуска-бельгійскі цэнтр, у Вільні працуе Віленская грамадская ініцыятыва «Дэмакратыя дзеля Беларусі». Там жа сёлета пачала дзейнічаць радыёстанцыя «Балтыйскія хвалі» з удзелам беларусаў. У Варшаве выходзяць «Беларускія ведамасці», працуе беларуская радыёстанцыя «Рацыя».

Крыўдна, канешне, канстатаваць сумны факт, што твая краіна ў новым тысячагоддзі па многіх параметрах выпадае з еўрапейскага кантэксту. Што праўляецца ўстойлівая тэндэнцыя росту беларускай дыяспары за кошт найбольш здольных, творчых, перспектыўных, прагматычных, высокапрафесійных выхадцаў з Беларусі. ■

ТЭАТР

ЧОРТ І БАБА НА ВОЛЬНАЙ СЦЭНЕ

АНДРЭЙ АХМЕТШЫН

Шырока вядомы жарт Францішка Аляхновіча «Чорт і Баба» ў інтэрпрэтацыі «Вольнай сцэны» атрымлівае новае, нечаканае гучанне. Трэцюю па ліку прэм'еру за бягучы сезон малады тэатр-студыя паказвае на сцэнічнай пляцоўцы Дома ветэранаў.



Сюжэт мініяцюры «Чорт і Баба» надзвычай просты. Менавіта таму Францішак Аляхновіч і надаў свайму драматычнаму твору звычайнае жанравае азначэнне – жарт. Проста – жарт... Злы дух (у народзе: чорт) выратавае пасварыць двух улюблёных, Мікітку і Марыську. За некалькі торбаў грошай ён «наймае» Бабу, сялянку, а па сумяшчальніцтву – вядзьмарку. Баба ўваходзіць у давер да Марыські і настойліва раіць ёй палячыць мужа ад таемнай хваробы, адрэзаўшы яму ноччу некалькі валасоў на барадзе. А Мікітке яна ж уцямлівае навіну аб тым, што гэтай ноччу яго жонка захоча з ім неміласэрна разабрацца, бо ў яе нібыта ёсць каханак.

Каб лепш зразумець алегарычны сэнс жарта ў інтэрпрэтацыі «Вольнай сцэны», нагадаем падзеі мінулага лета. У адзін прыгожы летні дзень мастацкаму кіраўніку Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Валерыю Мазынскаму адмовілі ў заключэнні кантракта. Замест пасады галоўнага рэжысёра яму прапанавалі ролю так званага «чарговага рэжысёра». Гэты чалавек стварыў тэатр, але цяпер ён тут аказаўся лішні. Мазынскі вырашыў пайсці на вольны хлеб. Яго падтрымала частка трупы РТБД, а таксама вядомая актрыса Тамара Міронава і некалькі маладых акцёраў. Так быў створаны новы тэатр-студыя «Вольная сцэна» пры Саюзе тэатральных дзеячаў.

Калі добра прыглядзецца, то ўсю гэтую драматычную гісторыю можна ўбачыць паміж радкоў жарта Францішка Аляхновіча.

Вясёлыя, задаволеныя жыццём Мікітка (арт. Ю. Жыгамонт) і Марыська (арт. Т. Папова) нават не здагадваюцца, што нехта з рожкамі ды ножкамі (чорт – арт. М. Рабычын) вельмі на іх злуецца... Аматары тэатра, напэўна, памятаюць, што менавіта такая, як гэтыя двое ўлюблёных, была «Вольная сцэна» яшчэ некалькі месяцаў таму. Вясёласцю, маладзёжным запалам яна выгодна адрознівалася ад некаторых іншых калектываў краіны. Тэатр і не ўяўляў, што хтосьці на яго ўжо вострыць зуб.

За *«дзве па тры»* торбы грошай Баба (арт. Т. Міронава) згаджаецца раз'яднаць шлюб маладых. Пад «бабай», пэўна, можна разумець зайздрасць, якая з-за прыбытку можа зрабіць кепскі ўчынак нават у адносінах да сяброў.

«Марысечка! Твой муж хворы! – галосіць Баба. – *Зрабі яму добрую справу. У поўнач адрэж сухі волас на яго барадзе!»* Наіўная «Марыська»... Так, Валерый Мазынскі ўжо не той Валерый Мазынскі, які дзесяць год таму стварыў тэатр. Але хто сказаў, што як мастак ён сябе вычарпаў? Хто мог у гэта паверыць? *«Зробім ракіроўку, перавядзем мэтра на ніжэйшую пасаду. Вось пабачыш: ён адразу памаладзее!..»* Эх, Марыська, Марыська! Паверыла.

Але гэта толькі палова інтрыгі. Вось што Баба кажа Мікітку, калі жонкі побач няма: *«Мілы! Яна ж табе здраджвае! Яна ж па іншым, маладым, сохне. Вось пабачыш! У поўнач яна возьме ў рукі нажніцы!..»* Што заставалася рабіць фактычна звольненаму кіраўніку РТБД? Глядзець, як «яна» забывае яго, таго, хто быў ёй мужам і бацькам. За недахопам службовых памяшканняў «чарговы рэжысёр» у Тэатры беларускай драматургіі не мае пэўнага месца працы акрамя сцэны. Можна было б скарыцца, можна было б сесці ў крэсла дзенебудзь у калідоры ці фае і сядзець... Але ў каго на гэта хопіць волі?

Настае гадзіна «ікс». Поўнач. Марыська ўзбройваецца вялізнымі нажніцамі. Мікітка рыхтуе ёй «у адказ» камень за пазухай. Напэўна, камень – сімвал скаргі. Мікітку і Марыську абкружаюць хлопцы і дзяўчаты (студэнты Універсітэта культуры). Яны клічуць па імёнах сваіх любімых, пэўна тых, з кім развёў лёс. І адказваюць самі сабе: «Нас не чуюць!..»

Кажуць, разрыў – гэта самае крыўднае, што можа адбыцца ў адносінах паміж людзмі. Разведзеныя муж і жонка рэдка бываюць шчаслівыя. Расколатае грамадства таксама губляе спакой, упэўненасць у сабе. Навука для ўсіх.

Не хочацца падрабязна спыняцца на недахопах спектакля. Навошта прад'яўляць высокія патрабаванні тым, хто толькі ачуняў пасля хваробы?

У памяці белыя плямы не застаюцца. Застаецца іншае. На даволі сціплай прэм'еры, у глядзельнай залі, дзе месцаў значна болей, чым у былым памяшканні «Вольнай сцэны», сядзіць інтэлігентная жанчына ў гадах. Светлыя валасы, акуляры, белы шалік... Пазнаеш вядомую актрысу Аляксандру Клімаву. Яна ўважліва глядзіць, шчыра апладзіруе. У яе вачах няма ацэнкі ўбачанаму. Жанчына, якая перажыла славу і хваробы, прыйшла падтрымаць тых, хто сёння падобны да яе. ■

АНДЭГРАЎНД

Паўлюк Канавальчык: «Гэта будзе круцей, чым «Момант Ісьціны»

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

Па горадзе ходзяць упартыя чуткі, нібы творчая групоўка «Чырвоны Жонд» разам з рэдакцыяй газэты «Навінкі» зьбіраецца правярнуць новы радыкальны мастацкі праект – здымкі паўнавартаснага фільму аб жыцьці сучаснай беларускай моладзі. У інтэрв'ю для «Згоды» чуткі й плёткі пракамэнтаваў адзін з натхняльнікаў праекту, галоўны рэдактар «Навінак» Паўлюк КАНАВАЛЬЧЫК.

– Гэта ўсё абсалютная праўда. Тое, што мы здымаем, будзе, напэўна, першым незалежным мастацкім фільмам у Рэспубліцы Беларусь, прысьвечаным маладзёжнай праблематыцы. Сэнс фільма – стварыць вобраз сучаснага беларускага хлопца, які жыве ў нашай краіне. Жыве тым жа жыцьцём, мае тыя ж праблемы, што й большасьць маладых беларусаў. Нашая мэта – адлюстраваць тыпаж маладога беларускага героя нашага часу. І карыстаючыся тым, што патэнцыйны глядач фільму будзе пазнаваць у ім сябе, падказаць нейкія мадэлі паводзінаў у сёньняшняй сытуацыі.

– Хто прымае ўдзел у стварэньні фільму?

– Рэдакцыя газэты «Навінкі» і антыпартыйная група «Чырвоны Жонд». Безумоўна, здымацца будуць толькі непрафэсыйныя акторы – гэта прынцыпова. Але тым ня менш фільм будзе зроблены на высокім мастацкім і тэхнічным узроўні.

– За кошт чаго вы плянуеце гэта зрабіць?

– За кошт сваіх мазгоў, заходніх грошай і ўсходняй тэхнічнай дапамогі. Дапамагае здымачная група з Масквы, нашыя сябры, якія доўгі час працавалі ў агульнавядомай праграме *«До 16 и старше»*. Яны таксама маюць досьвед моладзевай праблематыкі, і да таго ж валодаюць усёй неабходнай апаратурай для таго, каб зьняць і змантаваць гэты фільм. Безумоўна, яны маюць адносіны да анархічнай субкультуры і тусоўкі. Усе, хто прымае ўдзел, і нават зь фінансавага боку, – гэта ўсё анархістычныя колы.

– Як вы плянуеце выйсьці на нейкую шырокую аўдыторыю?

– Распаўсюд фільму – адна з самых важных і істотных задач. Гэта будзе цэлая стратэгія па прыданьне фільму максымальнага рэзанансу. Будзе задзейнічана сетка D.I.Y-распаўсюду, таксама будзе зроблена шмат відэакопій на касэтах (першапачаткова, канешне ж, бясплатных), якія будуць распаўсюджвацца ва ўсіх магчымых сфэрах. Мы паспрабуем загнаць фільм на нейкі тэлеканал альбо кінафэстываль.

– Раскажы падрабязьней пра сюжэт і канцэпцыю.

– Рабочая назва – «Выпадак з пацаном», але, безумоўна, гэта толькі рабочая назва. Далей будзе працягвацца праца як над сцэнарам фільму, так і над ягонай пракатнай назвай.

Галоўны герой – звычайны, больш-менш тыповы гарадзкі хлапец з раёну. Ён напачатку разгортваньня падзеяў мае праблемы з працай, зь мянтамі, іншыя праблемы, ад якіх не застрахаваны ніводзін сёньняшні малады чалавек. Далейшае разгортваньне падзеяў – даволі круты экшн.

– Не баіцеся паўтарыць шлях Дашука і Хашчавацкага, незалежныя фільмы якіх вядомыя толькі зьліце ды крытыкам міжнародных фэстываляў?

– Па-першае, я хачу падкрэсьліць, што ў адрозьненьне ад Дашука і Хашчавацкага, гэта ні ў якім разе не дакумэнталістыка, гэта прынцыпова мастацкі фільм.

Па-другое, ён здымаецца якраз не для фэстываляў, а для максымальна шырокай раскруткі на публіцы. Мэта – зрабіць у нечым нават папсовы, патэнцыйна прадавальны фільм.



Безумоўна, мы ставім на мэце зрабіць культавае кіно, кшталту такога, якім у Расеі стаў «Брат-2». Ды толькі ня проста культавае, але й папулярнае, прынятае ўсімі слаямі й субкультурамі моладзі.

– Значыцца, гэты фільм разьлічваецца адначасова й на валасатага нірваноіда й на гопніка з раёну?

– Задача-мінімум: каб і аднаму, і другому быў зразумелы гэты герой і ягоныя ўчынкі. Каб яны са свайго боку разумелі тое, што ён робіць, і якім чынам ён дзейнічае ў пэўных сытуацыях. І ўсьведамлялі, што ў такіх сытуацыях яны ў большасьці будуць рабіць тое самае.

– У нечым нагадвае канцэпцыю «Іглы» з Цоем?

– Калі ты ўзгадаў «Іглу», я б прыгадаў яшчэ й фільмы кшталту «Мяне клічуць Арлекіна». У тым сэнсе, што ў канцы 80-х, у часы перабудовы, у кіно была зацікаўленасьць тагачасным вобразам маладога чалавека. А пасьля гэтага часу ніводнай спробы адлюстраваць нейкія моладзевыя субкультуры або жыцьцё сучаснай моладзі ў мастацкім кіно, асабліва ў беларускім мастацкім кіно, не было зроблена.

Я магу прывесьці прыклад апошняга «шэдэўру» афіцыйнага «Беларусьфільму» – «Моманту ісьціны». Я сумняюся, што нехта з маладых пагледзіць гэты фільм. Напрыклад, я глядзеў яго выключна па працы, каб зрабіць ругацельную рэцэнзыю. Гэта ўсё ня мае абсалютна ніякага дачыненьня да сёньняшняй моладзі, ейных праблемаў і нават цікавасьцяў.

– Ці ёсьць у большасьці сучаснай моладзі тая субкультура, якую варта адлюстроўваць, ці яны яе ўсьвядомяць ужо пасьля таго, як пагледзяць кіно?

– Не, ну калі казаць пра «пацаноў» – гэта, з большага, міт, гэта проста людзі, якія жывуць нармальнымі паняцьцямі, не замарочваюцца на нейкіх абстрактных рэчах, а жывуць нармальным побытавым жыцьцём... І гэта, я лічу, нармальна.

– Хто прапісвае саундтрэк да стужкі?

– У саундтрэку, безумоўна, будуць прымаць удзел беларускія андэграўндныя гурты. Магчыма, мы зьвернемся да таго, каб адну ці дзьве кампазыцыі пусьціць ад так званых зорак, кшталту *N.R.M.* Таму што сэнс усяго фільму – максымальна ёмка адлюстраваць сёньняшнюю сытуацыю, сёньняшні спэктар субкультуры, сёньняшняе жыцьцё. І калі ёсьць, напрыклад, захапленьне *N.R.M.* альбо *Zet*, я думаю, мы зьвернемся да іх з прапановай. Калі без гэтага будзе не абысьціся.

– Калі пачынаюцца здымкі?

– Здымкі пачынаюцца з гэтага тыдня, і я спадзяюся, у два месяцы мы ўкладземся ды зробім гэты фільм. ■

СПОРТОБЗОР

Чехи вновь первые

В очередной раз финны продемонстрировали всему миру, что обладают одной из сильнейших на планете хоккейных команд, которая способна на многое. И тем не менее, им опять чего-то не хватило для выигрыша чемпионата мира. Пожалуй, никто больше в последние годы не может похвастаться столь внушительным набором серебряных и бронзовых наград мировых первенств. А вот золотая среди них лишь одна, и завоевана была в далеком 1995 году. Иногда кажется, что финны обречены быть вечно вторыми.

Именно в Германии представители Суоми были как никогда близки к тому, чтобы сломать столь неприятную для них традицию. После двух периодов финального поединка с чехами северяне вели 2:0 и вполне могли рассчитывать на победу. Ведь чехи славятся своей игрой от обороны, а здесь ситуация заставляла их идти вперед. Но сборная Чехии не напрасно считается лидером мирового хоккея, что она в очередной раз и подтвердила. Заключительный период продемонстрировал незаурядный характер действующих чемпионов мира и, что более важно, их мастерство. Основное время закончилось вничью 2:2, а овертайм принес чехам победу. И хотя плачущих после финальной сирены финнов было жалко, необходимо признать, что сборная Чехии эту победу заслужила. Бронза досталась шведам, переигравшим американцев 3:2.

Как ни печально, но наша команда провела этот чемпионат крайне неубедительно и вынуждена опуститься на ранг ниже. В следующем году сборная Беларуси будет выступать в дивизионе 1, чемпионат которого пройдет с 16 по 21 апреля в Голландии. Посыпать голову пеплом по поводу случившегося, а тем более искать крайних, сейчас нет смысла. Ведь проблемы нашей сборной были очевидны уже давно, просто пока был результат, на них не обращали внимания. Сейчас необходимо спокойно, не горячась, начать работу с новой командой, которая сумеет вернуть Беларуси место в компании сильнейших.

Гран-при Австрии

Сюрпризы эта гонка начала преподносить еще во время квалификаций, о чем свидетельствует расстановка гонщиков на стартовом поле. Вряд ли кто-либо до начала заездов рискнул бы предположить, что оба Макларена займут лишь четвертый ряд, а компанию Михаэлю Шумахеру на первой линии составит Хуан-Пабло Монтойя. Все говорило о том, что предстоит интереснейшая гонка. Именно так все и получилось.

Резво стартовав, пелетон возглавил Монтойя, сохранявший лидерство на протяжении пятнадцати кругов. После того, как он вместе с Шумахером-старшим вылетел с трассы, вперед вырвался Рубенс Баррикелло, который имел все шансы завершить гонку первым. Все решил заезд Рубенса и Михаэля в боксы. Дэвид Култхард воспользовался предоставленной ему возможностью на все сто и возглавил пелетон, доведя гонку до победы. Баррикелло же лишился и второго места. В конце гонки, по указанию руководства команды, он пропустил вперед Михаэля Шумахера.

Таким образом, разрыв между Шумахером и Култхардом еще более сократился. Теперь у них 42 и 38 очка соответственно. Нельзя сказать того же о кубке конструкторов, в котором отрыв «Феррари» от Макларена все увеличивается.

Сильнейшие определены

На минувшей неделе были определены сильнейшие баскетбольные клубы Европы. Не иначе как справедливыми следует назвать итоги «Финала четырех» Супралиги ФИБА, где выступали российский ЦСКА, израильский «Маккаби», турецкий «Эфес Пилсен» и греческий «Панатинаикос». Финал, как и ожидалось, стал повторением прошлогоднего. В решающем поединке встретились баскетболисты «Маккаби» и «Панатинаикоса». Только, в отличие от прошлогодней дуэли, на этот раз первенствовали израильтяне – 81:67. В игре за третье место ЦСКА уступил «Эфес Пилсену» 85:91.

Также определился первый и последний чемпион Евролиги УЛЕБ, для выявления которого понадобились все пять предусмотренных регламентом встреч. В упорной борьбе итальянского «Киндера» и испанского «Таугреса» сильнее оказались первые, выигравшие решающий поединок 82:74.

Пять туров позади

В понедельник были сыграны игры пятого тура чемпионата Беларуси по футболу, который привел турнирную таблицу национального первенства в относительное соответствие с нашими представлениями о силе и классе команд. С точки зрения подтверждения значимости претензий на чемпионское золото наиболее важным являлся поединок в Минске, где встречались местное «Динамо» и мозырьская «Славия». Интерес к встрече добавляло то, что соперники вынуждены провести между собой три встречи в течение недели (две игры на Кубок Беларуси). На этот раз, как и в первом поединке, «Динамо» уступило 0:1, вновь пропустив на последней минуте. Благодаря этой победе «Славия» сумела подняться на третью строчку в турнирной таблице.

Также необходимо отметить победу «Белшины» в гостях над «Торпедо-МАЗ» 1:0 и первое очко брестского «Динамо», добытое в поединке с «Молодечно» – 0:0. Остальные встречи тура закончились следующим образом: «Локомотив-96» – БАТЭ 0:3, «Гомель» – «Шахтер» 3:1, «Ведрич-97» – «Неман-Белкард» 1:5, «Нафтан-Девон» – Днепр-Трансмаш» 0:1.

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

	И	В	Н	П	М	О
Белшина (Бобруйск)	5	5	0	0	9-0	15
БАТЭ (Борисов)	5	4	1	0	10-2	13
Славия (Мозырь)	5	3	2	0	13-2	11
Неман-Белкард (Гродно)	5	3	1	1	13-3	10
Днепр-Трансмаш (Могилев)	5	3	0	2	7-6	9
Динамо (Минск)	5	2	1	2	10-8	7
Гомель	5	2	1	2	5-3	7
Торпедо-МАЗ (Минск)	5	2	1	2	4-4	7
Шахтер (Солигорск)	5	1	3	1	5-6	6
Молодечно-2000	5	1	2	2	2-7	5
Ведрич-97 (Речица)	5	1	0	4	4-13	3
Локомотив-96 (Витебск)	5	1	0	4	2-14	3
Нафтан-Девон (Новополоцк)	5	0	1	4	2-10	1
Динамо (Брест)	5	0	1	4	1-9	1

ПОНЕДЕЛЬНИК, 21 МАЯ

13.00, 15.00, 18.00, 23.50 Новости.
13.15 «Государственная граница». Фильм четвертый «Красный песок». 1-я серия.
14.35 Уроки Н.Новожиловой.
15.15 «Матрос Чижик». Худ. фильм для детей.
16.40 Теленавигатор.
17.00 «Все мои дети». Сериал.
18.20 Зона Икс.
18.30 Политические диалоги.
19.00 Боевик «Бешеная».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
21.45 Права человека: взгляд в мир.
22.00 «Человек моря». Сериал.
22.55 Стадион.
23.20 Планета «АРТ».
0.05 Плавание. Открытый чемпионат Беларуси.

14.20 Звездный час.
14.45 ...До шестнадцати и старше.
15.20 Мультсериал «Покемон».
15.45 Веселые истории в журнале «Ералаш».
15.55 «Воздушные замки». Сериал.
17.25 Спецрепортаж «Час ангела».
17.45 Жди меня.
18.40 «Кто хочет стать миллионером?» Телеигра.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время. Информационный канал.
21.00 Сериал «Секретные материалы».
22.45 Великое одиночество Андрея Сахарова.
23.50 Сериал «Человек ниоткуда».

7.30 «Москва - Минск».
7.45 «Православный календарь».
7.50 «Дежурная часть».
8.15 Боевик « Красная жара». 1988г.
10.30 «Санта-Барбара». Сериал.
16.30 «Простые истины». Сериал.
17.00 Брук Лэнгтон в приключенческом сериале «Сеть».
18.00 «Комиссар Рекс». Сериал.
19.30 Вести-Москва.
19.50 Комедия «Горько!» 1998г.
21.40 Михаил Жванецкий. «Простые вещи».
22.30 После вестей.
22.40 Подробности.
22.50 «Академик Сахаров. Неизвестные материалы». Док. фильм.
23.20 Деннис Хоппер в детективе «Шантаж». 1998г.
1.10 «Спорт за неделю».

13.30, 17.30, 19.30, 23.00 Новости культуры
13.45 Мультфильмы.
14.15 Сферы. Международное обозрение.
15.00 Новости
15.10 Кино-детям. «Остров-бабочка». Телесериал.
15.35 Мультфильм.
15.45 «Победители». Док. фильм. Режиссер В.Ярмошенко.
16.10 Сверхнаука. «Кибермозг».
16.35 «Удачи, Френчи». Художественный фильм. Режиссер А.Бонно. 1-я серия «Обманы войны». Часть 1-я.
17.40 «Мир авиации». Тележурнал.
18.05 «Что вы на это скажете?» Док. фильм. Режиссер М.Меркель.
18.40 «Юрий Симонов. Юбилей».
19.20 «Вечерняя сказка».
19.50 В.Шекспир «Ричард III». Спектакль Государственного Академического театра им.Евг.Вахтангова.
21.25 После новостей...
21.45 В.Шекспир «Ричард III». Спектакль Государственного Академического театра им.Евг.Вахтангова.
22.30 От киноавангарда к видеоарту. «Амазонки киноавангарда».

